прыдворнае адзенне, простыя чорна-чырвоныя касцюмы балета, дэталі якіх вельмі цікавыя (па ходу дзеяння яны ператвараюцца ў ордэнскія стужкі, блюзнерскія каўпакі, маскі і іншае, што спрыяе ўспрыманню ідэі спектакля).

Такім чынам, задача сучаснай сцэнаграфіі ў пастаноўцы музычнай камедыі — ва ўзнаўленні вобразна-прадметнага асяроддзя, стварэнні агульнай атмасферы дзеяння, абумоўленай канкрэтнай музычна-літаратурнай асновай.

**Піскун Н.Д.,**
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

## САЦЫЯЛЬНЫЯ, ЭТНІЧНЫЯ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫЯ І МІСТЫЧНЫЯ ГРУПЫ ПЕРСАНАЖАЎ БЕЛАРУСКАГА ШКОЛЬНАГА ТЭАТРА І БАТЛЕЙКІ

У XVI—пач.XX стагоддзя на тэрыторыі Беларусі існавалі два віды тэатра — школьны тэатр і батлейка. Кожны развіваўся па сваіх законах і прынцыпах. Аб'ядноўвала іх тая інтэрмедыйная частка прадстаўлення, якая нязменна выклікала ў гледачоў смех, весяліла іх словамі, макаранічнай мовай, двухсэнсавасцю, незвычайнымі дзеяннямі; рознымі непаразуменнямі, дасціпнымі падманамі, жартоўнымі фіналамі прадстаўленняў. Як інтэрмедыям школьнага тэатра, "жартоўнай" частцы батлейкі былі ўласцівы пэўныя персанажы. Некаторыя героі школьнага тэатра — Мужык, Жаўнер, Гандляр вінам, Слуга, Лекар, Яўрэй, Чорт — таксама перайшлі ў батлейку. Бясспрэчна, кожны з іх з'яўляўся прадстаўніком асобнай групы герояў. З аднаго боку, ён меў індывідуальнасць, з другога — быў зборным вобразам-"маскай".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Размежаванне персанажаў па групах на падставе якога-небудзь аднаго прынцыпу немагчыма з-за разнастайнасці герояў. Таму ў аснову групавання пакладзены фармальныя адзнакі. Героі-інтэрмедый падзелены на наступныя групы: сацыяльную, этнічную, прафесіянальную і містычную.

Сацыяльная група найбольш шматлікая. Асабліва яркімі фігурамі тут былі Мужык-Селянін і Пан-Шляхціц — традыцыйныя героі антыподы беларускага прафесійнага і народнага тэатральнага мастацтва.

Мужык у інтэрмедыях зваўся Мужыком, Селянінам або проста на імя (Архіпам, Гаўрылам, Пахомам, Іванам, Змітраком і г.д.). Ва ўкраінска-беларускіх інтэрмедыях Мужыка называлі Літвінам. З рускага райка да нас прыйшоў слуга волжскага двараніна Ванька.

Прыкідваючыся дурнаватым, Мужык не забываў заўважаць: "Калі б на панскую мудросць не мужыцкая хітросць, даўно б мужыкі пагіблі". І сцвярджаў гэта на справе, напрыклад, у дыспуце "на пальцах" з Самахвальскім. Кожны там разумеў жэсты па-свойму, аднак абодва заставаліся задаволенымі.

Разнастайныя прыгоды адбываліся з Мужыком у царкве і касцёле. Учыняючы танцы ў касцёле, перадражніваючы папа ў царкве, ён у выніку заўжды аказваўся закаваным у кайданы і разважаў: "Мужыком добрая мужыцкая вера, сабака з'есць і без солі". Яшчэ Мужык мог вылечыць Чорта, навучыць жыць Цыгана, патравіць поле Пана, пасядзець на Ірадавым троне; пасварыцца з Жыдам і адлупцаваць яго.

Своеасаблівыя адносіны былі са Студэнтамі, Вучнямі. Мужык спрабаваў то вытаргаваць у Студэнта для свайго сына розум і замест платы лупцаваў "гандляра розумам", то схаваць яго ад інспектара ў мяшок і біць палкай. Яно зразумела: пытанне дзяцей было для яго балючым. Не аднойчы скардзіцца Мужык на дзетак: "Ёсць у мяне дома Баўтрук-байструк, да жалься божа, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мужыком урадзіўся; такая прашкуда прамысльная ... калі б гэта розум на яго набыць, парушыў бы я сваю машну ...", ці "Да маю сынка-жэўжыка, такога, як парасятко свавольнае".

А Максім, сын мужыка Лобаса?! На Каляды ён збіраў у лесе грыбы: "малажэвікі, рыжыкі, баравікі". І бедаваў Мужык з гэтай нагоды, і калаціў гультаёў-студэнтаў, за якіх грошы бацькі плацілі, каб яны розуму навучыліся. Цэнтральнай была сцэна, калі Мужык аб'ядаўся куцці і ў яго балеў жывот. Хто толькі ні спрабаваў лячыць героя: і Жонка, і Цыган, і, зразумела, Доктар, у якога лепшыя лекі "кіем па хрыбту". Ёсць шмат запісаў гэтай сцэны, але сутнасць яе адна: толькі з галадухі мог Мужык аб'есціся дармавой куцці, толькі ад атрыманай "якаснай" адукацыі Доктар мог прапісваць такія лекі. Тыя, хто мае ўладу, у інтэрмедыях прадстаўлены Шляхціцам, Волжскім дваранінам, Памешчыкам Гурыновічам, Паннай Мальвінай і, безумоўна, Франтам-Элегантам.

Шляхціц цікавіўся ў Мужыка, ці пацалаваў жа ён, калі быў у Рыме, Папу Рымскага ў месца ніжэй паясніцы. На гэта Мужык адказваў, што з-за шляхты не мог прабіцца да Папы. Волжскі дваранін —"...не генерал,не палкоўнік, а з усяго свету пакойнік..."— разумеў, што без каня ездзіць яму будзе складана, таму пагаджаўся з прапановай слугі Ванькі: дзень дваранін едзе на слузе, два дні — слуга на ім. А Памешчык Гурыновіч, які не вярнуў мужыкам кароў, у выніку застаўся без кароў і без "родненькіх" быкоў. А Пані Мальвіна?! Жорстка абышлася з ёй народная фантазія: памерці ад халеры, аб'еўшыся малін, магчыма толькі ад вялікай прагнасці. А панскія прыспешнікі ў вобразах Тарадавога Мікіты, заўсёды п'янага, якому ў кабуру ад "пусталета" хабар засоўвалі, і земскага Арскага, які мякка сцяліў, але ад чыіх "падсцілак" было цяжка народу.

Вось і складваецца агульная думка пра паноў і падпанкаў. І, вядома, самая каларытная фігура сярод "уладных" людзей — Франт-Элегант. Ён прадстаўляўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як “элегант першай клясы”, а на самай справе быў хутарскім шляхцюком,-бедным, але ганарлівым і выхвальным: не бяда, што кішэня дзіравая! Галоўнае, яго продкам быў сам Ной, што, па сутнасці, і дазваляла яму пачаць будаўніцтва дома “аж да аркі Ноя”. Лічыў за лепшае Франт-Элегант апранацца з чужога пляча, валачыцца за дзеўкамі. А што “нос у табаке” і “сапог скрыпіць”, дык гэта не бяда. Галоўнае — знатнасць роду.

Другая група персанажаў вылучана па этнічнай прымеце. Яна прадстаўлена Цыганом, Цыганкай (Хоўрай), іх сынам Міхаськам, Казаком, Палякамі, Яўрэем (Жыдам), Яўрэйкаю (Сорай, Янкеліхай).

Цыган быў персанажам, у абавязкі якога ўваходзілі крадзеж коней, варажба (“... от як поворожу, то можеш жітям пострадаць”), лячэнне Мужыка булавою, лупцаванне Жонкі (якая для яго ж крала кураня і парася), замірэнне з ёй. Сын Цыгана Міхаська зарабляў на жыццё танцамі, меў у стайні варанога каня, прыгажуню-жонку, “злую цешчу-сатану”.

Казак з’яўляўся на сцэне і прадстаўляўся: “Знаеце, хто я такой? Я казак-небарак са сцепі-поля. Вот здзесь казаковы роскаш і воля. А ў казака-дурака жынкі няма, адна душа ў целе, вшы ўсю галаву аб’елі”. Пра род сваіх заняткаў ён казаў так: “Работы не маю. Жыдоў б’ю, водку п’ю, весела гуляю”. Увогуле Казаку дасталася “пачэсная” роля высвятлення адносін з дапамогай сілы: ён біў Цыгана за крадзеных коней, Бабу-шапялуху за спробу аказання “першай дапамогі”, Бабу — за тое, што варыць куццю ў дзень Раства Хрыстова, Яўрэя — проста за сам факт існавання.

Палякі прадстаўлены ў якасці персанажаў, якіх можна было або проста не разумець (у лепшым варыянце), або якім можна было сказаць: “Нешта ты прывязаўся як гавенным лыкам, харпоснік ты, курвін сын, саланнік, гарэлы ты кутак!” Можна было з дапамогаю Чорта злавіць Ляха, за забойства Дзяка ўтапіць яго ў балоце. Бачна, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палякаў не вельмі шанавалі.

Яўрэі прысутнічалі практычна ва ўсіх інтэрмедыях (ва ўсялякім выпадку ў батлеечных) у вялікай разнастайнасці. Яўрэй (Жыд або Янкель, Ёсель або Бэрка) у інтэрмедыях быў гарэлачным каралём ці дробным гандляром. Ён нажываўся тым, што за не вельмі дабраякасны тавар забіраў у мужыка апошняе. І адзіным персанажам, якога білі ўсе і паўсюль. Кожная сцэна з Яўрэем заканчвалася смерцю апошняга — "забойствам". Такі персанаж, як Чорт, быў з ім увогуле неразлучны: дапамагаў Яўрэю рухацца ў пекла, калі той ужо не дыхаў.

Апрача "жартоўнай" часткі батлейкі, Яўрэй нядрэнна сябе адчуваў у "сур'ёзнай" на паслугах у Цара Ірада. Аднак калі "крулік" памірае, то першы, прынюхваючыся, паведамляе аб гэтым: "Я думаў, што мосці крулік шпіць, а наш мосці крулік даўно ўжэ шмердзіць". А пасля смерці Ірада да яго можна звярнуцца так, як ён заслугоўвае: "Яснавяльможны свіняны кныр!" Вось цяпер ёсць падстава і магчымасць, заняўшы трон Ірада, стаць "каралём над яўрэямі". Аднак часцей свой жыццёвы шлях у інтэрмедыях Яўрэй заканчваў бясслаўна. Яго жонка, "Сора, выпісана із Парыза ўцора", нядоўга аплаквала страту мужа: "Цорт цябе вазьмі! У мяне заўтра другій будзець!"

Да групы, вылучанай па прафесіянальнай прымеце, адносіліся Астраном, Літарат, бакаляр Самахвальскі, Доктар, Баба-варажбітка, Венгр-алейкар, Купцы, Злодзей (Разбойнік) і "вайскоўцы".

Астраном прадстаўляў яшчэ групу палякаў, паколькі быў родам адтуль, нораву беларускіх мужыкоў не ведаў. Гэта відаць з лаянкі, якую ён пасылае ў адрас мужыкоў, якія вырашылі: да яго трэба стаць ракам, бо ён народжаны пад знакам Рака.

Літарат і Самахвальскі прадстаўлялі частку "вучоных дзеячаў", якая або збірае вялікія бібліятэкі, ды ахапіць розумам змест усіх кніг не ў стане, або хутка падхоплівае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новае, ім незразумелае, дурыць людзям галовы жэстамі замест таго, каб размаўляць "чалавечым языком". Затое Мужык, па прынцыпе "чым менш ведаеш, тым менш у галаве блытаецца", выходзіць пераможцам у параўнанні са спужаным Літаратам.

Доктар-шарлатан, Баба-варажбітка і Венгр-алейкар любога і рассмешаць, і напужаюць сваім "прафесіяналізмам". Калі яны спрабуюць вылечыць то Мужыка, які аб'еўся куцці, то пабітага Жаўнера, здаровую паненку, якая з'язджае з глузду ад гультайства, ды яшчэ патрабуюць платы, становіцца зразумела, чаму іх "лечаць" іх жа лекамі. Наўрад выратуе ад галаўнога болю рэцэпт: "Абрыць вам галаву дагала, парным малаком прывязаць і паленам па галаве ўдараць! Ваш галоў будзе здароў".

"Купцы" ў інтэрмедыях былі нячыстымі на руку і за гэта заўсёды пабітымі. З'яўляліся на сцэне ў абарваным выглядзе (Купец Вольскі), за што прасілі ў публікі прабачэння. Часам іх суправаджалі Пані Бараноўская альбо Пані Якубоўская; адметнай рысай апошняй была поўная адсутнасць валасоў на галаве.

Адзін з персанажаў — гэта Злодзей, які дзякуючы хітрасці абувае кароў і быкоў у дваццаць пар лапцей, крадзе іх у Пана, а потым вяртае мужыкам кароў і да таго ж двух панскіх быкоў.

"Вайскоўцы" былі ўсіх рангаў і званняў, ад салдата да генерала. Генерал камандаваў Салдатамі, што маршыравалі па сцэне і стралялі з гармат. Афіцэр з дапамогаю Свацці шукаў сабе Нявесту, пасля ішоў з ёй "піць чай". Жаўнеры біліся, спрабуючы высветліць, хто з паненак чыя жонка. Часам на сцэне ўсё заканчвалася вельмі драматычна: або адзін з Жаўнераў забіваў другога, або Гетман забіваў Салдата шабляй, што ўвогуле для арміі не было такой ужо надзвычайнай падзеяй.

Асобна можна паставіць сцэны з Аляксандрам Македонскім і Порам Індыйскім, Рыцарам Хрысціянскім і Рыцарам Турэцкім, Воінам Рускім і Воінам Турэцкім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сцэне разгортвалася бітва: Аляксандр Македонскі перамагаў Пора Індыйскага, Рыцар Хрысціянскі — Рыцара Турэцкага, Воін Рускі — Воіна Турэцкага. Адкуль з'явіліся гэтыя персанажы ў беларускіх інтэрмедыях — тэма наступнага даследавання.

Да групы містычных персанажаў адносяцца Чорт (Д'ябал) і Смерць. Чорт прадстаўляўся: "А вось я бес, сысматыцкі сын". Яму ў інтэрмедыях даручалі чорную работу —"цягнуць усё надарэмнае ў пекла". Калі ён зносіў туды цела забітага Карчмара, то казаў: "Гдзе ты, грэшная душка? Вочкі, як пёрлачкі, зубкі, як каралкі, хвасток, як сярпок, на кончыку стрэлачка". Часам, каб пераканацца, што кліент сапраўды памёр, ён на ўсялякі выпадак біў яго галавой аб дзвярны вушак. Чэрці ж гуляюць галавою самога Цара Ірада і смяюцца, іншым разам прыгаворваючы: "Ух! Ух! Многа сала! Наша сала! Добрая будзе поліўка!" Радзей Чорт з'яўляўся ў сцэне з Мужыком, які аб'еўся куцці, і Бабай, што на Раство варыла кашу, але ўсюды паводзіў сябе "па-чартоўску": хрыпеў, круціўся побач, чапляў хвастом. Смерць рэдка з'яўлялася ў інтэрмедыях батлейкі, а калі з'яўлялася, дык выконвала "чортаву работу".

Такія асноўныя групы герояў інтэрмедый школьнага тэатра і батлейкі XVI—пач. XX стагоддзя, якія былі сфарміраваны часам і адлюстроўвалі асноўныя сацыяльныя, этнічныя, прафесіянальныя і містычныя групы насельніцтва Беларусі, герояў яго міфалогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ